■ Шпацыр па Камароўцы

# НА РЫНКУ БУЙСТВА ВІТАМІНАЎ

## На прылаўках суседнічаюць першыя кавуны і лісічкі

**Чарэшні і клубніцы не губляюць сваёй папулярнасці. Аднак іх пастулова выцясняюць персікі і нектарыны, маліны і чарніцы, суніцы ды слівы. Дзе-нідзе чакаюць пакупнікоў першыя кавуны і дыні. Адным словам, ад «жывых вітамінаў» вочы разбягаюцца!**

**Лічыльнік «Звязды»**
*(цана за кілаграм, калі не пазначана іншае)*

**Сала салёнае** — *100-130 тыс.*
**Свініна (кумпяк)** — *85-100 тыс.*
**Свініна (выразка)** — *100 тыс.*
**Ялавічына (кумпяк)** — *130-160 тыс.*
**Фарш (з ялавічыны)** — *60 тыс.*
**Індычка (філе)** — *125 тыс.*
**Кураня бройлернае (бядро)** — *48 тыс.*
**Сардэлькі (з мяса птушкі)** — *42 тыс.*
**Бекон** — *110 тыс.*
**Каўбаса сервелат фінскі** — *120 тыс.*
**Сальцісон** — *100 тыс.*
**Сасіскі з кетчупам** — *38 тыс.*
**Скумбрыя вэнджаная** — *150 тыс.*
**Корушка вяленая** (100 г) — *26 тыс.*
**Яйка курынае** — Д-В (дзясятак) — *16 тыс.*
**Яйка перапялінае** (20 шт.) — *27 тыс.*
**Грэчка** (800 г) — *20 тыс.*
**Гарох** (800 г) — *10 тыс.*
**Фасоля** (800 г) — *27 тыс.*
**Рыс доўгі** (800 г) — *13 тыс.*
**Алей сланечнікавы рафінаваны** (1 л) — *20-26 тыс.*

Але параўнаем цэны. Цяпер сярэдняя цана на чарэшню складае 45 тысяч рублёў. Буйныя ягады аддаюць па 75 тысяч рублёў. Некаторыя прадаўцы прапаноўвалі свой тавар нават за 90 альбо за 100 тысяч рублёў. Радуе, што на прылавках стала больш айчынных клубніц. Прыдбаць кілаграм смакоцця можна за 35-50 тысяч рублёў. Малдаўскія ды іспанскія абрыкосы прапануюць адпаведна па 40 і 50 тысяч рублёў за кілаграм. За такую ж суму можна набыць кіло персікаў альбо нектарынаў. З Іспаніі прыехалі буйныя пругкія іспанскія слівы — іх прадаюць за 50 альбо 55 тысяч рублёў за кілаграм. (Дарэчы, столькі ж каштуе адзін плод авакада, а вось адно манга аддаюць за 85 тысяч рублёў.)

За кілаграм асіповіцкіх малін просяць не менш як 120 тысяч рублёў, а з Беразіно — 100 тысяч рублёў.

Паўлітровы слоік духмянай ягады выходзіць у сярэднім за 50 тысяч рублёў. Кілаграм суніц аддаюць па 70-80 тысяч рублёў, сярэдні кошт на чарніцы складае 35 тысяч рублёў.

Першыя кавуны сустракаюцца па розных цэнах: у адным месцы — 6 тысяч рублёў за кілаграм, у іншым — 16 тысяч за кілаграм. Невялікія дыні «калгасніца» ідуць па 45-50 тысяч за кілаграм.

Памідоры ёсць па розных коштах, але беларускія выходзяць бюджэтнымі: за кілаграм «Малышка» просяць 27 тысяч рублёў. Для параўнання — вялізныя ружовыя з Украіны каштуюць на дзесяць тысяч даражэй. Але самыя «залатыя» таматы сорту «Бычынае сэрца»: іх аддаюць не менш як за 65 тысяч рублёў.

Агуркі лёгка знайсці па 7, 8, 9 тысяч рублёў за кілаграм, хоць сустракаюцца і па 12-13 тысяч. Маладую капусту аддаюць па 10 тысяч рублёў, раннія буракі — па 15-16 тысяч рублёў за кілаграм. Коштавы дыяпазон на маладую бульбу пачынаецца з 6 тысяч рублёў і даходзіць да 18 тысяч рублёў за кілаграм. Вялікі пучок радыскі прапануюць па 35 тысяч рублёў — гэта эквівалент тром галоўкам часнаку, альбо «букету» са стаграмовых пукоў зялёнай цыбулі, кропу, пятрушкі, ліставой салаты і рукалы.

На прылаўках знайшліся і лісічкі — па 150 тысяч рублёў за кілаграм. Для параўнання — кіло шампіньёнаў каштуе ў сярэднім 45 тысяч рублёў.

Завяршаючы шпацыр па «Камароўцы», з асалодай спаталяю смагу квасам — паўлітра халоднага напою каштуе 10 тысяч рублёў.

**Кацярына РАДЗЮК**

■ Соцыум

# ХЛОПЧЫК ВЫРАС, ДЫ ЛЁС НЕ ПЕРАМЕНІШ

## Нататкі пасля камандзіроўкі па пісьму

**Гэта пісьмо можна было адразу пакласці ў архіў, бо яно не змяшчае прозвішча аўтара і тым самым трапляе ў разрад ананімак. Але ліст нагадваў крык душы аб дапамозе хлопчыку, тым больш інваліду. Суседзі, так падпісаны зварот у рэдакцыю, расказваюць, што хлопчык Саша Хлебнік, які жыве па вуліцы Леніна ў Пружанах, рана застаўся без маці, цяпер ён не дагледжаны, забыты, пакінуты, часам, магчыма, галадае. А бацька даўно жыве ў Мінску з новай сям'ёй, пра сына забыўся, пакінуўшы дзіця пад апекай сваёй сястры, значыць, Сашынай цёткі.**

Першае, што падумалася пасля прачытання, што быць такога не можа. Спецыялісты з аддзелаў адукацыі адсочваюць дзяцей-сірот і аператыўна прымаюць меры па іх абароне. У аддзеле адукацыі райвыканкама сказалі, што непаўналетняга інваліда з такім прозвішчам у іх горадзе няма. Пазней высветлілася, што Аляксандр Хлебнік, інвалід другой групы, пражывае ў Пружанах па вуліцы Леніна. Яму 31 год.

А для старых суседзяў, на чыіх вачах ён вырас, Саша па-ранейшаму застаецца хлопчыкам. І гэта можна зразумець, як і іх абурэнне бацькам Аляксандра, які мала ўвагі ўдзяляе хвораму сыну. Але не ўсё так проста.

**З псіхолагам раённага тэрытарыяльнага цэнтра абслугоўвання насельніцтва Ганнай МЫШКЕВІЧ** наведваем Галіну Несцярчук, з якой і пражывае разам Аляксандр Хлебнік. У доме хоць і бедна, але даволі чыста і акуратна. Галіна Міхайлаўна запрашае прысесці на кухні, дзе мы з ёй і гутарым.

54-гадовая Галіна Несцярчук не працуе праз інваліднасць, у яе праблемы з пазваночнікам. Раней яна доўгі час працавала медсястрой. Калі гаворка заходзіць пра Сашынага бацьку, гаспадыня дома вельмі нервуецца, расказвае эмацыянальна, часам амаль зрываючыся на крык скрозь слёзы. Але пастулова яна супакойваецца, і вымалёўваецца няпростая гісторыя жыцця маладога інваліда.

Нарадзіўся Саша глухім, ёсць і іншыя праблемы са здароўем. Маці хлопчыка хварэла на рассеяны склероз і памерла, калі дзіцяці было ўсяго пяць гадоў. Гадавалі яго бабуля і цётка Галіна. Бацька неўзабаве стварыў новую сям'ю і ўжо шмат гадоў жыве ў Мінску.

Сашу на некаторы час адпраўлялі ў спецыялізаваныя ўстановы, дзе ён вучыўся ў асяродку равеснікаў. Малады чалавек не гаворыць, але ўсё разумее, бо добра ўмее чытаць па губах.

— Ён быў асабліва прывязаны сэрцам да бабулі, — расказвае Галіна. Яна ў канцы жыцця зусім аслепла. Саша быў для яе вачамі, а яна для яго вушамі, так яны падтрымлівалі адно аднаго.

Дзесяць гадоў таму бабуля памерла, указаўшы ў завяшчанні, што права на дом пераходзіць да дачкі Галіны. Праўда, гэта было зроблена са згоды сына Генадзя, ён не прэтэндаваў на сваю частку спадчыны, аддаючы належнае сястры за яе гатоўнасць даглядаць пляменніка.

Нельга сказаць, што цяпер ён зусім не падтрымлівае сына. Паводле слоў Галіны, брат штомесяц прысылае па 500 тысяч рублёў; калі яна папросіць, то пераводзе крыху больш, напрыклад 700 тысяч. «Але ж гэта вельмі мала, — абураецца жанчына. — Сашына пенсія складае 1 700 000 рублёў, мая — 2 500 000. Трэба ж хлопца накарміць, апрануць, купіць лекі. У яго праблемы з падстраўнікавай залозай, перыядычна праводзяцца курсы лячэння. А ў хаце даўно неабходны рамонт».

Яна лічыць, што брат мог бы дапамагаць больш адчувальна. І прычынай такой скупаватасці Галіна называе новую жонку брата. Суседзі ёй нават раілі падаць у суд і спагнаць аліменты з Генадзя на ўтрыманне сына. Толькі яна палічыла ў дачыненні да брата такі крок непрымальным, нават высвятляць не стала, ці сапраўды магчыма так вырашыць пытанне.

— Саша — мой сын, я яго выгадавала змалку, і нават калі будзе толькі мая і яго пенсія, нейк пражывём. У цягніку некалі сустрэлася з жанчынай. Тая прапанавала паваражыць на картах і сказала: «У цябе будзе сын, але не твой, да таго ж інвалід». Тады мне было 23 гады, жыццё наперадзе, яно здавалася шчаслівым, неабсяжна-бясконцым, нават увагі асаблівай не звярнула на такое прароцтва. А потым усё стала збывацца. Відаць, такі лёс. Такі мой крыж, і мне яго несці, — хавае за штучнай усмешкай слёзы жанчына.

Галіна Міхайлаўна расказвае, што у іх ёсць свой агарод, на якім Саша ёй першы памочнік. Ён з задавальненнем гатуе на кухні розныя стравы, але трэба крыху пакамандаваць, адным словам, многае можа зрабіць пад наглядам. І псіхолаг Ганна Мышкевіч успомніла, калі яна наведвала гэту сям'ю папярэдні раз, Аляксандр смажыў бліны на кухні. Яшчэ ў Галіны ёсць невялікі дамок у вёсцы, куды яны таксама час ад часу наведваюцца разам. І там Саша дапамагае падтрымліваць парадак.

Яшчэ раз уважліва чытаем ліст з **дырэктарам тэрытарыяльнага цэнтра Нэлі ПЕДЧАНКА.** Нэлі Георгіеўна кажа, што па іх мерках гэта звычайная сям'я інвалідаў. Звяртаю яе ўвагу на радок, дзе суседзі згадваюць любоў да выпіўкі як Галіны, так і яе сужыцеля. «Можа, дыму без агню не бывае. Але ж не злоўжываюць яны так, каб п'янымі валяліся, — заўважае дырэктар цэнтра. — Кожную нядзелю Галіна з пляменнікам ходзяць у царкву на службу. Вось толькі наш цэнтр для дзённага знаходжання інвалідаў Аляксандр Хлебнік не наведвае. Яго запрашалі, ён і цётка яго не адмаўляюцца, але і прыходзіць малады чалавек не спяшаецца. А ў нас дзейнічае вельмі добрая праграма па рэабілітацыі маладых інвалідаў. Яны займаюцца ў розных гуртках, вучацца».

* * *

Пра гэту сям'ю не скажаш, што тут жыве шчасце. Лёс, як у многіх людзей з паталогіямі, так і тых, хто побач з імі, незайздросны. Невялікія даходы, пастаянная нехватка грошай, адсутнасць якіх-небудзь перспектыў накладваюць свой адбітак. Але ж людзі прызвычаіліся жыць, падтрымліваць адно аднаго, іншага ім не дадзена. Відаць, і суседзі складалі свой ліст у рэдакцыю не з горшымі думкамі альбо намерамі. Толькі вось прымусіць бацьку, які дасягнуў пенсійнага ўзросту, больш дапамагаць сыну-інваліду наўрад ці ў каго атрымаецца. Гэта пытанні сумлення і асабістага выбару кожнага.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
*г. Пружаны*

# Медыкі, эколагі, цырульнікі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зніжаць напружанасць у грамадстве будуць медыятары сацыяльных канфліктаў і спецыялісты па адаптацыі мігрантаў. Кансультант па бяспецы асабістага профілю будзе праглядаць інфармацыю ў сеціве пра кліента і, калі неабходна, падчышчаць яго анлайн-вобраз. Вырасце попыт на трэндвотчараў (тых, хто адсочвае новыя тэндэнцыі) і распрацоўшчыкаў персанальных пенсійных планаў.

Гэты аналіз рабілі з улікам сітуацыі на расійскім рынку працы, але, на думку **старшага даследчыка CASE Belarus (Цэнтр сацыяльных і эканамічных даследаванняў) Уладзіміра ВАЛЕТКІ,** прагнозы цалкам верагодны і для беларускіх рэалій.

Эксперт раіць таксама звяртаць увагу на новыя напрамкі, якія адкрываюцца ў ВНУ. Гэта непасрэдны водгук на попыт з боку рынку працы.

— Прынамсі ў БДЭУ летась пачалася падрыхтоўка эканамістаў-аналітыкаў у межах спецыяльнасці «Нацыянальная эканоміка». Выпускнікі змогуць ацэньваць не толькі стан эканомікі рэгіёнаў, фінансавага рынку, але і эфектыўнасць дзяржаўных і карпаратыўных праграм і палітык. У спецыялізаванай эканаметрычнай лабараторыі на базе прыкладнога пакета аналізу Stata студэнты будуць авалодваць сучаснымі колькаснымі і якаснымі метадамі аналізу, такімі як фокус-групы, экспертныя апытанні, — прыводзіць прыклад Уладзімір Валетка.

Сярод цікавых сёлетніх навінак — 3D-мадэляванне (працаваць з трохмернымі тэхналогіямі будуць вучыць у БДТУ), біяінфарматыка (спецыяльнасць прапануе БДУ), тэхнічная праца і тэхнічная творчасць (Полацкі дзяржаўны універсітэт).

Апроч гэтага, будзе расці попыт на высакакласных спецыялістаў па найме персаналу. «Бо канкурэнтаздольнасць эканомікі вызначаецца як якасцю чалавечага капіталу, так і адпаведнасцю людзей месцу працы», — заўважае даследчык.

### Бібліятэкары і турагенты знікнуць?

Хто на рынку ў будучым акажацца лішнім? Апошнія гады пастулова зніжалася патрэба ў рабочай сіле. Калі ў 2011-м у агульнай структуры вакансій доля такіх месцаў складала амаль 78 працэнтаў, то цяпер — менш за палову.

Скарачаецца попыт на кадры ў банкаўскай сферы. «Мы гэта бачым на працягу апошніх трох гадоў, — каментуе Алег Токун. — Гэта праца, дзе многае можа быць аўтаматызавана. Ужо сёння некаторыя банкі адмаўляюцца прымаць плацяжы ад насельніцтва, ставяць тэрміналы».

— Будзе змяншацца патрэба ў тэхнічных работніках, кшталту падлікоўцаў, — дадае Уладзімір Валетка. — Неабходнасць у персанале, які займаецца ўводам даных, таксама адпадзе, паколькі сучасныя айцітэхналогіі дазваляюць лёгка запісаць інфармацыю ў электронным выглядзе, абмінаючы папяровы варыянт.

У даведніку, распрацаваным «Сколкава», сярод спецыяльнасцяў-«пенсіянераў» — бібліятэкары, паштальёны, турагенты, капірайтары. Расійскія даследчыкі ўпэўнены, што да 2020 года гэтыя прафесіі знікнуць. Беларускія эксперты не такія катэгарычныя. «Магчыма, калісьці так і будзе, але не ў бліжэйшыя 10 гадоў», — выказаўся Алег Токун.

Прагнозы не заўсёды цалкам спраўджваюцца, адзначае прадстаўнік міністэрства.

— Некалі думалі, што нам не патрэбна будзе столькі бухгалтараў, колькі ёсць. Планавалася, што ўкараніцца праграмнае забеспячэнне і замест пяці работнікаў будзе адзін, які з усім справіцца. Існавалі нават праекты па перанавучанні бухгалтараў у праграмісты. Але гэтага чамусьці не адбылося. Не ўгадалі і з псіхолагамі. Гадоў 15 таму казалі, што яны будуць вельмі папулярныя. Жыццё паказала, што не настолькі. Псіхолагі ў нас занялі пэўную нішу ў школах і дзіцячых садах.



Эксперты раяць прыглядзецца да новых спецыяльнасцяў у ВНУ.

### Адгадаць на 100 працэнтаў немагчыма

Прагназаваннем сітуацыі на рынку працы звычайна займаецца сістэма прадбачання будучых кваліфікацый, skills anticipation. У Беларусі, як і ў іншых постсавецкіх краінах, робяцца толькі першыя крокі да наладжвання такіх механізмаў. У 2014 годзе былі створаны дзве рабочыя групы, якія курыруе Міністэрства эканомікі. Першая вывучае кароткатэрміновую сітуацыю на біржы, ажно да зацвярджэння кантрольных лічбаў па наборы ў ВНУ студэнтаў за кошт бюджэтных сродкаў. Другая — глядзіць на доўгатэрміновыя перспектывы, спрабуе стыкаваць патрэбы рынку працы, магчымасці сістэмы адукацыі і дэмаграфічную сітуацыю.

З наступнага года распачынаецца яшчэ адзін праект у гэтым напрамку. Універсітэты на працягу трох гадоў будуць адсочваць сваіх выпускнікоў. Маніторыць, наколькі задаволены тыя атрыманай адукацыяй, ці дынамічна прасоўваюцца па кар'ернай лесвіцы. На думку Уладзіміра Валеткі, такі праект дапаможа ў распрацоўцы сістэмы прадбачання будучых кваліфікацый.

Разам з тым стапрацэнтна спрагназаваць патрэбы эканомікі ў кадрах складана. У міністэрстве заўважаюць, што фактычна ніводная краіна ў свеце на сёння не вырашыла гэта пытанне.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*